*Жарын, Д. В.* Артыкулы экспарту Ганзы з рэгіёна Падзвіння ў XIII–XV ст. / Д. В. Жарын // Лістападаўскія сустрэчы – 5. Праблемы старажытнасці і сярэднявечча: Зборнік артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гонар акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава (13–14 лістапада 2003 г., Мінск) / Навук. рэд. В. А. Фядосік і І. А. Еўтухоў. – Мн.: БДУ, 2005. – С. 140-144.

***Д. В. Жарын***

# АРТЫКУЛЫ ЭКСПАРТУ ГАНЗЫ З РЭГІЁНА ПАДЗВІННЯ Ў XIII–XV СТ.

Калі разглядаць, па якіх артыкулах ішоў гандаль ганзейцаў у Падзвінні, то зразумела, што асартымент тавараў быў даволі шырокі. Ганза была зацікаўлена ў трывалых сувязях з гэтым рэгіёнам, па-першае, таму, што з яго ў Еўропу ішла сыравіна, прадукты сельскай і лясной гаспадаркі. Другой прычынай, па якой Ганза шукала паразумення з Полацкам і Віцебскам, было тое, што ў гэтыя гарады, а таксама ў Вільню, яна экспартавала гатовыя вырабы рамеснай вытворчасці нямецкіх, французскіх, англійскіх, нідэрландскіх, і, нават, іспанскіх і італьянскіх майстроў. Такі гандаль прыносіў немцам велізарныя прыбыткі і спрыяў развіццю таварна-грашовых адносін у самой Германіі, а таксама ён даваў штуршок развіццю апошніх у Вялікім княстве Літоўскім.

Адным з галоўных прадуктаў, якія ганзейцы вывозілі з Падзвіння ў Рыгу і далей у Заходнюю Еўропу, быў воск. Воск у сярэднявеччы з'яўляўся вельмі каштоўным прадуктам, які выкарыстоўваўся з рознымі мэтамі. З воску выраблялі свечкі, а таксама фігуркі



якія нагадвалі хворыя часткі цела чалавека (гэты звычай быў распаўсюджаным сярод католікаў Еўропы). Людзі верылі, што калі зробленую такім чынам ляльку чалавечага органа спаліць на царкоўным агні, дык хвароба разам з растопленым воскам адступіць ад чалавека. Выкарыстоўваўся воск і для вырабу пячатак, якімі зацвярджалі розныя дакументы. Першым, хто звярнуў увагу на гандаль воскам, быў прыбалтыйскі гісторык Г. Гільдэбрант. Ён надрукаваў тэксты Рыжскай даўгавой кнігі XIII — пачатку XIV ст. і паставіў шэраг пытанняў, якія тычыліся паходжання экспартуемага з Рыгі воску, яго цаны, якасці і г. д. Ён прыйшоў да высновы, што болыпая частка воску трапляла ў Рыгу з зямель Вялікага княства Літоўскага, а дакладней з раёнаў Падзвіння. Бяспрэчна, лясы вакол Полацка былі прыдатныя да збірання воску і мёду. А нашыя продкі займаліся гэтай справай даволі ўмела. «У прыгарадных лясах ставілі борці. З калоды ў добры год бралі колькі карчагаў мёду. Бралі воск. Галоўнымі канкурэнтамі бортнікаў былі, вядома ж, мядзведзі. Борці яны ведалі не горш, чым гаспадары, таму пад кожную, каб ласун не здолеў падабрацца да салодзенькага, вакол стаўбура ладзілі шырокі шчыт — подкур»[1].

На працягу XIV—XV ст. праходзіў працэс спецыялізацыі промыслаў. Адным з найболып ранніх промыслаў і было бортніцтва. У XIV ст. часцяком узгадваюцца «бортнікі», «бортныя вёскі», «бортныя старосты». У XV ст. разам з выкарыстаннем прыроднага дупла для пчол пачалі ў дрэвах выразаць спецыяльныя борці. Сталі ствараюцца і асобныя бортныя брацтвы, якія мелі свае адметныя знакі і сімволіку. Пакравіцелем жа ўсіх бортнікаў з'яўляўся Іаан Златавуст. У крыніцах XIV—XV ст. узгадваюцца таксама і раменікі, якія займаліся «прабойкаю» (пэратапленнем) воску. Воск з'яўляўся, бадай, самым галоўным экспартным таварам Полацкай зямлі, таму так

шмат увагі надавалася яго здабыццю і пераапрацоўцы. Эвалюцыю вытворчасці воску можна прасачыць па якасці гэтага тавара. На знешні рынак воск трапляў некалькіх сартоў. У рыжскай даўгавой кнізе канца XIII — пачатку XIV ст. дакладна адрозніваўся воск (cera solute, resolute, liquida, liquefacta, smelten cera, smolt was) і вашчына (cera non resolute, non liquefacta, unsmolten cera, ungesmolten was). На думку Гільдэбранта лівонскія гарады атрымлівалі частку воску ў выглядзе вашчыны, ператаплівалі яе, і затым адпраўлялі далей у Еўропу, бо экспарт вашчыны

[1] *Арлоў У. А.* Таямніцы Полацкай гісторыі. Мн., 2000. С. 62-63.



быў катэгарычна забаронены. Разам з вашчынай у Рыгу прыходзіў воск у «кругах», гэта значыць ужо ператоплены.

Чысты воск, які складаў асноўную частку агульнага экспарту воску, дакладна адрозніваўся па якасці. Ужо ў Рыжскай даўгавой кнізе прыводзіліся розныя віды воску: cera cum pede (cera gevotet, votet was) і cera sine pede. Можна зрабіць выснову, што гэтыя назвы адпавядалі сучасным уяўленням пра першы і другі гатункі. Воск першага гатунку, ператоплены ў сонечных воскатапільнях, быў белага колеру, без прымесяў. Воск другога гатунку — цёмна- жоўты альбо светла-карычневы, без прымесяў, але з адстоем (асадкам), не перавышаючым 1/3 высаты круга, ён насіў назву vot, ад старажытнанямецкай мовы vot = fuss — нага, ступня. У рэшце рэшт воск трэцяга гатунку — цёмна-карычневы, буры альбо шэры, з адстоем каля 1/2 высаты круга (прэсавы воск з вытопкаў). Такі воск ганзейцам набываць забаранялася. Правам мець пячатку для воску ў XIV ст. карысталіся толькі лівонскія гарады — Рыга і Рэвель. Гэты факт і яшчэ некаторыя іншыя даюць падставу лічыць, што менавіта ў XIV ст. вываз воску з Падзвіння дасягнуў сваёй вышэйшай кропкі, і што ён з’яўляўся самым значным з усёй Усходняй Еўропы. Пазней, у XV ст., а дакладней -— у 1426 г. пячатку для воску атрымала таксама і Нарва, гэта зрабіла яе раўнапраўнай удзельніцай гандлю з ганзейцамі ў Прыбалтыцы, актыўнай суперніцай старых экспарцёраў воску — Рыгі і Рэвеля.

У канцы XIII — пачатку XIV ст. колькасць воску з Падзвіння, што быў набыты толькі ў крэдыт у Рызе і адпраўлены ў Фландрыю і Англію, вагалася ад 4—5 т да 10—11 т штогадова. Напрыканцы XV ст. асноўны вашчаны гандаль перамясціўся з Рыгі, якая ў XIV ст. была галоўным цэнтрам экспарту воску, у Рэвель. Гэта сведчыла пра тое, што ганзейцы таксама развівалі гандаль з Псковам і Ноўгарадам. Калі ў XIV ст. галоўнымі экспарцёрамі воску былі Полацкая і Смаленская землі, то да канца XV ст. на першае месца выходзяць больш аддаленыя раёны. Такім чынам бачна, што гандаль воскам у XIV — і часткова ў XV ст. быў завязаны на беларускія землі, а нямецкія гандляры набывалі тут гэты прадукт у патрэбных ім колькасцях.

Яшчэ адным з прадуктаў, што ганзейцы вывозілі з Полацка, быў мёд. У тыя часы цукар толькі пачаў уваходзіць ва ўжытак жыхароў Еўропы, таму мёд заставаўся тым натуральным прадуктам, які замяняў цукар. Беларускі мёд быў вельмі цудоўнай якасці, і рыжскі магістрат заўсёды клапаціўся аб тым, каб бочачка мёду знаходзілася на святочным стале ганзейцаў і мясцовага высакароднага

купецтва. Асаблівага росквіту гандаль мёдам дасягнуў у канцы XIV—XV ст., але і ў XVI ст. ён меў даволі сур'ёзную вагу ў знешнім гандлі ВКЛ. Нездарма ў Статуце ВКЛ у 1529 г. надаецца вялікая ўвага «бортнай справе» і ўсталёўваюцца правілы збірання мёду.

У Еўропе ахвотна набывалі шкуры і футра з усходнееўрапейскага абшару. Вырабы са скуры і футра былі прадметамі раскошы, якія мог набыць не кожны; іх куплялі заможныя гараджане, патрыцыі, знаць, каралі, вельмі шчодра расплочваючыся. Некаторыя нават верылі, што футра валодае магічнымі сіламі, таму і набывалі яго. Лідзіруючыя пазіцыі ў гандлі футрам, безумоўна, займаў Ноўгарад. У гэты паўночны рускі горад прыязджалі нямецкія гандляры, якія жадалі хутка разбагацець, бо той, хто меў справу з футрам, атрымліваў вялікія прыбыткі. Але з упэўненасцю можна сцвярджаць, што ў XIV—XV ст. і Вялікае княства прымала ўдзел у гандлі шкурамі і футрам. Напрыклад, у Полацк у 1456 г. прыбыла партыя футра, сярод якога былі шкуркі бабра (bever), мядзведзя, рысі, вавёркі, собаля, андатры. Ганзейцы таксама набывалі шкуры лісы, воўка, зайца, але ў меншых колькасцях.

Рэгіён Падзвіння спрадвеку славіўся лясным багаццем. Самыя цэнныя пароды драўніны Ганза ў асноўным вывозіла з Польшчы і Прусіі, дзе раслі лісцевыя пароды дрэў. З іх выраблялі нават арбалеты англійскіх і швейцарскіх ваяроў. З зямель Вялікага княства галоўным чынам ішлі хваёвыя пароды лесу. Драўніну сплаўлялі да Рыгі, а там грузілі на караблі і перавозілі далей у Еўропу. З яе выраблялі карабельныя мачты, будавалі каркасы фахверкавых дамоў, выраблялі мэблю. Шырока выкарыстоўваўся лес і ў карабельнай справе. Дзякуючы наяўнасці драўніны з Прусіі, Польшчы і Вялікага княства караблебудаўніцтва Ганзы развівалася досыць хуткімі тэмпамі. Галоўнае месца ў гэтай справе заняў горад Данцыг, дзе былі агромністыя карабельныя докі і гавань. Пазней лідзіруючыя пазіцыі перахапіў Гамбург.

Не толькі лес з'яўляўся важным артыкулам гандлю. Таксама з зямель ВКЛ у Еўропу траплялі смала, дзёгаць, попел, сажа, якія знаходзілі выкарыстанне ў вытворчасці і афарбоўцы фландрскіх тканін, у вытворчасці спецыяльных прапітак для караблёў, каб тыя пад уздзеяннем марской вады не гнілі. У некаторых раёнах Вялікага княства даволі паспяхова вырошчвалі лён і каноплі, якія затым траплялі ў рукі нямецкім купцам. З гэтых раслін у Заходняй Еўропе выраблялі вяроўкі-канаты для караблёў, а таксама тканіны для ветразяў. Іншым прадуктам, што вывозіўся з беларускіх зямель, з'яўлялася збожжа.



Але не толькі сыравіну, прадукты сельскай і лясной гаспадаркі вывозілі ганзейскія гандляры з Падзвіння, адсюль вывозілі ўжо і гатовыя вырабы мясцовых рамеснікаў, асабліва скураныя. Таксама карысталася попытам у немцаў прадукцыя беларускіх бондараў.

Можна зрабіць выснову, што ганзейскі гандаль з рэгіёнам Падзвіння быў даволі насычаны па сваёй сутнасці, а экспарт сыравіны, альбо тавараў з тэрыторыі Вялікага княства прыносіў немцам велізарныя прыбыткі.